# Медалі Радзівілаў XVII ст.[1]

Ганна БЫЛЬ



ДУ «Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», начальнік аддзела ўліку і захавання фондаў, Рэспубліка Беларусь, г. Нясвіж, e-mail: ganyssa@rambler.ru

Першымі, хто прынёс на землі Вялікага Княства Літоўскага моду на выраб медалёў, былі Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565) і яго сын Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка (1549–1616). Менавіта яны знаходзіліся ля вытокаў стварэння мюнцкабінетаў на тэрыторыі Беларусі. Крыху пазней гэту моду пераняла біржанская лінія Радзівілаў, у выніку чаго з'явілася не толькі нумізматычная калекцыя ў Біржах, але і серыя медалёў, якая паклала пачатак традыцыі стварэння медалёў родам Радзівілаў, што існуе і па сённяшні час.

Медальернае мастацтва было прэрагатывай выбранага кола людзей. Заказчыкамі і пакупнікамі ў асноўным з'яўляліся прадстаўнікі каралеўскага двара і звязаныя з імі свецкія і царкоўныя саноўнікі, а таксама багатыя мяшчане. Шмат хто з мецэнатаў замаўляў свае партрэтныя медалі ў мастакоў, якія працавалі за мяжой [6, p. 304]. Біржанская лінія роду Радзівілаў была яскравым прыкладам гэтага. Калі ў XVI ст. толькі з'явіліся першыя калекцыянеры медалёў, то ў XVII ст. гэта стала сапраўднай модай, трэндам таго часу, колькасць асабістых калекцый медалёў сярод шляхты і духавенства значна павялічылася.

Ёсць звесткі, што першыя свае медалі прадстаўнікі біржанскай лініі роду Радзівілаў замаўлялі на Віленскім манетным двары, які дзейнічаў да 1627 г., і цесна працавалі з медальерам Ганушам Трыльнерам (Hanusz Trylner) (?–1652) [6, p. 45]. Але з цягам часу яны вымушаны былі звярнуцца да нямецкіх медальераў, запрошаных у Гданьск.

Трэба адзначыць, што ў 30-х гг. XVII ст. Гданьск з'яўляўся вялікім балтыйскім портам. З аднаго боку, гэта была брама экспарту збожжа на Захад, а з другога – брама імпарту для рэчаў заходняга паходжання. Сюды з'язджаліся замежныя мастакі з розных краін, у першую чаргу з Італіі, Францыі і Германіі. Такім чынам, Себасцьян Дадлер (Sebastian Dadler) (1586–1657) і яго вучань Ян Хён Старэйшы (Jan Höhn) (1607–1664), якія паходзілі са Страсбурга, не былі выключэннем. Па меркаванні польскага даследчыка Адама Войцэка, менавіта Крыштаф Радзівіл (1585–1640), прадстаўнік біржанскай лініі роду, польны гетман літоўскі, упершыню запрасіў нямецкага медальера С. Дадлера ў 1634 г. у Гданьск. Спецыяльнасць ювеліра майстар атрымаў у Аўгсбургу, а з 1621 г. па 1630 г. працаваў у якасці прыдворнага мастака і ювеліра пры двары саксонскага электара ў Дрэздэне [5, p. 2]. Па прычыне таго, што на тэрыторыі Германіі ў гэты час працягвалася Трыццацігадовая вайна (1618–1648), медальер без сумненняў прыняў рашэнне аб пераездзе ў Гданьск, дзе да яго ў 1636 г. далучыўся вучань Ян Хён Старэйшы [2, p. 95].

Майстэрства Дадлера абапіралася на дасягненні мастацкай культуры Францыі, Германіі і Польшчы. Ён з'яўляўся майстрам у выкананні выяў, зробленых у прасторавай глыбіні. Найбольш праявіў сваё майстэрства нямецкі медальер у гістарычных медалях. Упершыню мода на іх, як сцвярджаюць польскія даследчыкі, з'явілася яшчэ ў другой палове XVI ст. у сувязі з войнамі, якія вёў кароль Рэчы Паспалітай Стэфан Баторый [6, p. 305].

Лічыцца, што першым медалём Себасцьяна Дадлера, які быў зроблены ў Гданьску, з'яўляўся медаль, замоўлены Крыштафам Радзівілам у 1634 г. з нагоды перамогі караля Рэчы Паспалітай Уладзіслава IV Вазы ў Смаленскай вайне [5, p. 3]. Такім чынам, Крыштаф імкнуўся падкрэсліць трыумф караля і адначасова захаваць памяць аб асабістым удзеле ў ваенных дзеяннях. Наступныя медалі, зробленыя Себасцьянам Дадлерам, былі звязаны з сынам Крыштафа Радзівіла Янушам (1612–1655). Першы медаль Себасцьяна Дадлера датычыўся ўзяцця горада Кіева ў 1651 г. Янушам Радзівілам, другі – быў зроблены ў гонар надання пасады віленскага ваяводы Янушу ў 1653 г. Хутчэй за ўсё, медалі былі зроблены па замове самога Януша. Першы – як успамін пра пік яго вайсковай славы і адначасова пра перамогу над Кіевам, якую ён падарыў каралю Яну II Казіміру Вазе, звяртаючыся да яго праз надпіс на медалі на латыні: «Вось, Радзівіл аддаў табе, о кароль Казімір, зламаныя кіеўскія лукі і мяцежныя калчаны». Другі – аб набліжэнні да вяршыні палітычнай магутнасці Януша Радзівіла, які імкнуўся ўвекавечыць свой уезд у Вільню, загадаўшы выбіць медаль з выявай свайго новазбудаванага віленскага палаца і надпісам на латыні: «Пакуль ты нясеш сваю службу, пакуль будуеш высокія палацы, твая Вільня з поўным правам будзе зваць цябе ваяводам».

На першым плане медаля 1634 г. перавага аддаецца выяве караля Уладзіслава IV Вазы, які сядзіць на ваенных трафеях на фоне каралеўскага шатра, па

[1] *Артыкул падрыхтаваны на аснове даклада, які прагучаў на Міжнароднай нумізматычнай канферэнцыі «Беларускаму рублю – 25», што праходзіла 14–16 кастрычніка 2019 г. у Мінску.*

баках якога знаходзяцца паноплії[2] і звязаныя палонныя. На другім плане знаходзіцца панарама горада Смаленска, перад якім развярнулася батальная сцэна: апошняя бітва, у выніку якой маскоўскія войскі вымушаны былі падпісаць акт аб капітуляцыі. Зверху над выявамі знаходзяцца птушкі, якія кідаюцца на здабычу *(малюнак 1)*.



*Медаль «У гонар перамогі Уладзіслава IV Вазы і Крыштафа Радзівіла пад Смаленскам у 1634 г.» (d – 62,0 мм (Av))*

***Малюнак 1***

На медалі за ўзяцце Кіева на фоне панарамы горада, умацаванага абарончай сцяной, і разбураных мuроў, на якіх сядзіць анёл, трымаючы герб горада, размешчана алегарычная выява працэсу перадачы ключа ад горада Кіева польным гетманам Янушам Радзівілам каралю Рэчы Паспалітай Яну II Казіміру. За каралём знаходзіцца войска, якое трымае штандары з выявамі герба Каралеўства Польскага («Арол»), герба Швецыі («Тры кароны»), герба дынастыі Вазаў («Сноп»). Насупраць караля знаходзіцца Януш Радзівіл, за якім таксама размясцілася войска са штандарамі з выявамі герба Вялікага Княства Літоўскага («Пагоня») і герба роду Радзівілаў («Трубы»). Кіеў быў заняты войскамі Януша без бою, таму што ў бітве пад Лоевам польны гетман ушчэнт разбіў казацкія войскі на чале з чарнігаўскім палкоўнікам Марцінам Нябабам. Гэта падзея атрымала адлюстраванне ў легендзе на адваротным баку медаля *(малюнак 2)*.



*Медаль «За ўзяцце Кіева Янушам Радзівілам у 1651 г.» (d – 68,0 мм (Av))*

***Малюнак 2***

Медалі на ваенную тэматыку былі вельмі папулярныя ў часы Уладзіслава IV Вазы і Яна Казіміра. Ландшафтныя элементы, панарамы гарадоў, адлюстраваныя на медалях, стварaлі перспектыву, прасторавую глыбіню і ілюзіянізм, якія з'яўляліся рысамі стылю барока [5, p. 305]. Як і ў рэнесансным мастацтве XVI ст., на другім плане выступаў такі элемент, як пейзаж. Складаныя сюжэтныя лініі выяў з'яўляліся знакам высокай якасці майстра медальернага мастацтва.

Што тычыцца медаля ў гонар нaдання пасады Янушу Радзівілу ў 1653 г., то на першым плане перавага аддавалася коннай выяве князя, па баках ад якой знаходзіліся ахоўнікі з алебардамі, на фоне горада Вільні. Трэба адзначыць, што з самага пачатку медальерскай працы Себасцьян Дадлер звяртаўся да коннай выявы, своеасаблівa інтэрпрэтаванай на фоне прасторавых і ландшафтных элементаў [6, p. 59]. У дадзеным выпадку аўтар імкнуўся перадаць усю ўрачыстасць самой падзеі, аб чым сведчыць шматлікасць людзей і карэт перад палацам Радзівілаў *(малюнак 3)*.



*Медаль «Януш Радзівіл – ваявода Віленскі з 1653 г.» (d – 68,0 мм)*

***Малюнак 3***

Акрамя гэтага, свае медалі нямецкі медальер рабіў у срэбры ці золаце і выкарыстоўваў сігнатуру: S. D. (Sebastian Dadler), якая знаходзілася пад выявай караля, у завітках картуша з надпісам або пад выявай палаца.

Такім чынам, гістарычныя радзівілаўскія медалі былі зроблены з мэтай праслаўлення свайго роду на палітычнай арэне таго часу як унутры краіны, так і за яе межамі. Польскія даследчыкі адзначаюць, што гатовы медаль князь мог выкарыстоўваць у якасці асабістага падарунка як для блізкіх і верных асоб, так і для запрошаных знатных прадстаўнікоў замежных краін [6, p. 56]. Акрамя гэтага, традыцыю, якую пачаў Крыштаф Радзівіл з дапамогай Себасцьяна Дадлера, працягнуў яго сын Януш Радзівіл, нават нягледзячы на тое, што нямецкі медальер у 1648 г. пасля заканчэння Трыццацігадовай вайны вярнуўся ў Германію [5, p. 3].

Наступная група медалёў біржанскай лініі Радзівілаў была выканана Янам Хёнам Малодшым (Jan Höhn) (1642–1693), сынам Яна Хёна Старэйшага. Ян Хён Малодшы нарадзіўся і пражыў усё

*[2] Паноплії ў мастацтве рэнесанса і барока ўяўлялі сабой дэкаратыўную кампазіцыю з элементаў ваенных даспехаў, шчытоў, зброі і сцягоў, у дадзеным выпадку гэта штандары, гарматы і ядры.*

сваё жыццё ў Гданьску. Працаваў на Гданьскім манетным двары, выконваў таксама замовы польскага каралеўскага двара і прыватных асоб [1, р. 95–96].

Майстэрства Яна Хёна Малодшага абапіралася на работы яго бацькі Яна Хёна Старэйшага. Менавіта праз апошняга гданьскі медальер пераняў тэхніку і стыль вырабу медалёў нямецкага майстра Себасцьяна Дадлера і, такім чынам, ускосна з'яўляўся яго вучнем. У 14 гадоў у 1656 г. зрабіў свае першыя медалі на гістарычную тэматыку па замове прускага двара. Да смерці бацькі ў 1664 г. працаваў разам з ім і часта ставіў такія ж сігнатуры, як і ён, што вельмі ўскладняла вызначэнне аўтарства кожнага з іх. Пасля таго як Ян Хён Старэйшы памёр, Ян Хён Малодшы стаў адным з высокакваліфікаваных медальераў Польшчы, якія выраблялі медалі і ў срэбры, і ў золаце [6, р. 65]. Ён найбольш праявіў свой талент у партрэтных медалях, сведчаннем чаго з'яўлялася серыя медалёў, прымеркаваных да шлюбу, народзінаў і смерці, зробленая па загадзе Багуслава Радзівіла (1620–1669) і яго дачкі Людвікі Караліны (1667–1695).

Адным з першых медалёў Багуслава Радзівіла, якія ён замовіў у гданьскага медальера, з'яўляўся медаль у гонар яго шлюбу са стрыечнай пляменніцай Ганнай Марыяй Радзівіл у 1665 г. *(малюнак 4)*. Рэч у тым, што пасля смерці свайго стрыечнага брата Януша Радзівіла ў 1655 г. Багуслаў быў апекуном адзінай яго дачкі Ганны Марыі Радзівіл, якой па спадчыне ад бацькі перайшлі вялікія зямельныя ўладанні. Пасля таго як крэўныя і сваякі Ганны Марыі сталі рабіць спробы выдаць багатую князёўну за іншых літоўскіх паноў, Багуслаў Радзівіл вырашыў сам ажаніцца з ёй і такім чынам сканцэнтраваць у сваіх руках уладу над усімі землямі, што належалі біржанскай лініі роду Радзівілаў. Але шлях да шлюбу быў вельмі цяжкім. Па-першае, блізкае кроўнае сваяцтва стала сур'ёзнай перашкодай. Па-другое, Багуслаў быў пратэстантам, а Ганна Марыя была выхавана сваёй маці Кацярынай з роду Патоцкіх каталічкай, у сувязі з чым для шлюбу патрабаваўся папскі дазвол, атрымаць які было даволі складана [4, р. 170]. Але, нягледзячы на ўсе шматлікія палітычныя інтрыгі, у якія так ці інакш быў уцягнуты князь Багуслаў, шлюб адбыўся, і сведчаннем гэтага стаў медаль.




*Медаль «Да шлюбу Багуслава Радзівіла і Ганны Марыі Радзівіл» (d – 46,0 мм)*

***Малюнак 4***

Але найбольшая колькасць медалёў у гонар Багуслава Радзівіла была зроблена Янам Хёнам з нагоды яго смерці *(малюнкі 5, 6)*. 31 снежня 1669 г. у прускім горадзе Каралеўцы (Кёнігсберг) на 49-м годзе жыцця памёр апошні прадстаўнік біржанскіх князёў Радзівілаў па мужчынскай лініі Багуслаў Радзівіл [4, р. 172]. Адзінай яго дачцэ Людвіцы Караліне на той момант споўнілася толькі два гады. Хто з'яўляўся замоўцам медалёў у гданьскага майстра ў 1670 г., пакуль невядома.




*Медаль «У гонар Багуслава Радзівіла» (d – 28,0 мм)*

***Малюнак 5***



*Медаль «У гонар Багуслава Радзівіла» (d – 47,0 мм)*

***Малюнак 6***

Гэтыя медалі найбольш цікавыя сваімі алегарычнымі і сімвалістычнымі фігурамі. Што тычыцца выяў партрэтаў, то звычайна яны былі зроблены ці ў анфас, ці ў профіль у правы бок. На адным з такіх медалёў Багуслава Радзівіла пад партрэтам знаходзіцца выява маскі, якая смяецца. Але найбольшую ўвагу звяртае на сябе алегарычная выява з трох абеліскаў, кожны з якіх у аснове манумента ўтрымлівае дату і легенду. Першы абеліск з датай 1620 г. і легендай: *ORBI* (Свету), увенчаны крылатым сонцам, сімвалізуе жыццё і год нараджэння Багуслава Радзівіла. Другі – з датай 1665 г. і надпісам: *SIBI* (Сабе), увенчаны парай галубоў, сімвалізуе каханне і шлюб Багуслава Радзівіла і Ганны Марыі Радзівіл. І апошні, трэці, абеліск з датай 1669 г., легендай: *NATURAE* (Прыродзе) і чэрапам з крыламі азначае смерць і год пахавання Багуслава Радзівіла *(малюнак 7)*. Такім чынам, алегарычная выява з пейзажнымі матывамі паказвала ўсе галоўныя этапы жыцця князя.



*Медаль «У гонар Багуслава Радзівіла» (d – 46,0 мм)*

***Малюнак 7***

На другім медалі пад узыходзячым сонцам знаходзіцца выява рукі, працягнутай з воблака, якая трымае паднятую ўверх шпагу з лаўровым вянком *(малюнак 8)*. На канцы шпагі размешчана расплюшчанае вока – духоўна-рэлігійны сімвал, цесна звязаны са святлом, спазнаннем і адкрыццём праўды. Акрамя гэтага, вока з'яўлялася таксама раннім сімвалам Бога-Айца да таго часу, калі яго пачалі адлюстроўваць у выглядзе чалавека. Рука, якая працягнута з воблака, разглядаецца як указанне на прысутнасць Бога, увасабленне яго ўлады, волі і моцы, а часам нават і расплаты. Воблака ж хавае боскую славу і веліч, якія ні адзін чалавек не можа ўбачыць і застацца ў жывых. У залежнасці ад кантэксту такая рука можа трымаць што заўгодна, напрыклад меч, галінку ад дрэва ці нават трохкутнік, што бачна на іншых радзівілаўскіх медалях, дзе таксама адлюстравана менавіта правая рука – сімвал літасці ў адрозненне ад левай – сімвала справядлівасці.




*Медаль «У гонар Багуслава Радзівіла» (d – 28,0 мм)*

***Малюнак 8***

Наступныя медалі з алегарычнымі і сімвалістычнымі матывамі былі створаны ў гонар дачкі Багуслава Радзівіла Людвікі Караліны, апошняй з біржанскага роду Радзівілаў. Медаль, зроблены ў 1675 г. да 8-годдзя княгіні, з выявай панарамы горада Біржы на другім плане і пейзажнымі матывамі на пярэднім найбольш вядомы на сённяшні час. На першым плане медаля адлюстравана разгалінаванае дрэва, на якім адна птушка сядзіць у гняздзе ў цені галінкі, якую трымае рука. Дзве іншыя птушкі адлятаюць да сонца, у цэнтры якога знаходзіцца імя Бога. Птушка, што застаецца на дрэве, сімвалізуе Людвіку Караліну, а дзве іншыя – яе бацькоў: маці Ганну Марыю, што памерла пад час родаў у 1667 г. (ёй было толькі 27 гадоў), і бацьку Багуслава Радзівіла, які сканаў праз два гады пасля маці ў выніку інсульту. Людвіка Караліна засталася сіратой. Біблейскі надпіс з Псалтыра, адной з кніг Старога Запавету, у ніжняй частцы медаля распавядае пра лёс княгіні: «Мой бацька і мая маці кінулі мяне; але Гасподзь мяне прыме, 27 псалом, 10 верш»[3]. Герб, які знаходзіца пад дрэвам, сведчыць пра тое, што Людвіка паходзіць са знатнага роду Радзівілаў.

На сённяшні дзень існуе некалькі варыянтаў гэтага срэбнага медаля, якія адрозніваюцца па якасці выканання і размяшчэнні назвы горада BIRSE (пад промнямі сонца і пад дрэвам). Першы варыянт з біблейскім надпісам з Псалтыра, а другі – больш скарочаная версія той жа легенды: «Мае бацькі пакінулі мяне» *(малюнак 9)*. Тыраж, на жаль, на сённяшні дзень невядомы, але гэты медаль сустракаецца найбольш на інтэрнэт-аўкцыёнах.



*Медаль «У гонар Людвікі Караліны Радзівіл» (d – 40,0 мм)*

***Малюнак 9***

На другім медалі ў гонар Людвікі Караліны Радзівіл на першым плане размешчана выява маладога дрэва, якое прывязана да вертыкальнай апоры, што знаходзіцца побач. Над дрэвам размешчана рука, працягнутая з воблака, якая трымае роўнабаковы трохкутнік з маятнікам у цэнтры. Хутчэй за ўсё, маладое дрэва сімвалізуе саму Людвіку Караліну, прывязаную абставінамі да роднай зямлі. На другім плане – пейзажная выява з будынкамі з правага і левага бакоў ад дрэва. Медаль быў адчаканены ў срэбры і золаце *(малюнак 10)*.

Такім чынам, медалі Багуслава Радзівіла і яго дачкі Людвікі Караліны адлюстроўвалі іх жыццёвыя этапы. Людвіка Караліна засталася сіратой і спадчынніцай вялікай маёмасці, якую ў барацьбе за апякунства ў выніку атрымаў брандэнбургскі курфюрст Фрыдрых Вільгельм, пасля чаго Людвіка Караліна трапіла ў Берлін. Адзін толькі нясвіжскі князь Міхал Казімір Радзівіл не

[3] *Пераклад лацінскай цытаты паводле версіі Васіля Сёмухі (Псалтыр 26:10). Нумар псалма ў розных моўных версіях можа быць 26 або 27.*



*Медаль «У гонар Людвікі Караліны Радзівіл» (d – 30,0 мм)*
***Малюнак 10***

губляў надзеі вярнуць зямельныя ўладанні роду Радзівілаў і нават рабіў спробы ажаніць сваіх сыноў з княгіняй, але гэта толькі сапсавала адносіны паміж сваякамі [3, p. 296].

Пасля смерці Міхала Казіміра Радзівіла Людвіка Караліна працягнула традыцыю медальернага мастацтва і замовіла апошні свой медаль у гданьскага медальера ў 1680 г. у сувязі са смерцю нясвіжскага князя ***(малюнак 11)***. Медаль у памяць Міхала Казіміра Радзівіла быў цікавы тым, што толькі на ім у адрозненне ад іншых ёсць ініцыялы гданьскага медальера: I. H. (Jan Höhn). Акрамя гэтага, адваротны бок упрыгожаны алегорыяй: выявай арла ў гняздзе на скале, які не можа ўзляцець да сонца, таму што яму перашкаджаюць вецер і маланка.



*Медаль «У гонар Міхала Казіміра Радзівіла» (d – 49,0 мм)*
***Малюнак 11***

Адзіны медаль, які істотна адрозніваецца ад іншых радзівілаўскіх медалёў, – гэта медаль у гонар Альбрэхта Станіслава Радзівіла (1593–1656), алыцкага князя і канцлера Вялікага Княства Літоўскага, зроблены ў 1656 г. у сувязі з яго смерцю. Вельмі часта медаль таксама адносяць да гданьскай школы медальернага мастацтва. Медаль алыцкага князя вельмі адрозніваецца ад іншых. Па-першае, ён аднабаковы, і таму яго можна назваць медальёнам, а па-другое, медаль можна сустрэць у розных ажурных абрамленнях, якія ўвайшлі ў моду ў перыяд сталага барока. Такія медалі можна было выкарыстоўваць у якасці ўпрыгожання на ланцужку ***(малюнак 12)***. На сённяшні момант цяжка сказаць, хто з'яўляўся аўтарам.



*Медалі «У гонар Альбрэхта Станіслава Радзівіла» (77,0 х 65,0 мм)*
***Малюнак 12***

Такім чынам, усе вышэйадзначаныя медалі Яна Хёна Малодшага, зробленыя па замове біржанскай лініі роду Радзівілаў, былі створаны ў адным мастацкім стылі. Вельмі ўражвае іх колькасць і варыятыўнасць, што яшчэ раз сведчыць аб сапраўднай модзе таго часу, з дапамогай якой можна прасачыць вельмі важныя палітычныя і гістарычныя падзеі, звязаныя з біржанскай лініяй Радзівілаў. Акрамя гэтага, медалі з'яўляюцца сапраўднымі помнікамі мастацтва стылю барока і вынікам працы гданьскай школы медальернага мастацва, якая ўзнікла не без удзелу роду Радзівілаў і праіснавала на працягу ўсяго XVII ст. Дзіўным супадзеннем застаецца тое, што ў 1693 г. памірае апошні прадстаўнік гданьскай медальернай школы Ян Хён Малодшы, а ў 1695 г. пасля смерці Людвікі Караліны Радзівіл перастае існаваць біржанская лінія  Радзівілаў. XVII ст. стала сапраўдным пікам стварэння медалёў па загадзе роду Радзівілаў, што перарасло ў традыцыю, якая існуе і па сённяшні дзень, аб чым сведчаць медалі Мацея Радзівіла і Дзіяны Марыі Радзівіл.

***Бібліяграфічны спіс:***

*1. Hőhn (Hoehn) Jan młodszy // Słownik artystów polskich i obcych w Polsce działających: malarze, rzeźbiarze, graficy. – T. III: H-Ki. – Wroclaw–Warszawa–Kraków–Gdańsk, 1979. – S. 95–96.*

*2. Hőhn (Hoehn) Jan starszy // Słownik artystów polskich i obcych w Polsce działających: malarze, rzeźbiarze, graficy. – T. III: H-Ki. – Wroclaw–Warszawa–Kraków–Gdańsk, 1979. – S. 94–95.*

*3. Jaroszuk, J. Radziwiłł Michał Kazimierz / J. Jaroszuk // Polski słownik biograficzny. – T. XXX, z. 2. – Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk–Łódź, 1987. – S. 292–299.*

*4. Wasilewski, T. Radziwiłł Bogusław / T. Wasilewski //  Polski słownik biograficzny. – T. XXX, z. 1. – Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk–Łódź, 1987. – S. 161–172.*

5. *Więcek, A. Dadler Sebastian / A. Więcek // Słownik artystów polskich i obcych w Polsce dziąłających: malarze, rzeźbiarze, graficy. – T. II: D-G. – Wroclaw–Warszawa–Kraków–Gdańsk, 1975. – S. 2–3.*

6. *Więcek, A. Dzieje sztuki medalierskiej w Polsce / A. Więcek. – Krakow: Wydawnictwo Literackie, 1989. – S. 327.*

## The Radziwill Medals of the XVII century

**HANNA BYL,** *National Historical and Cultural Museum and Reserve «Niasvizh», Head of Funds' Accounting and Storage Division, Republic of Belarus, Minsk, e-mail: ganyssa@rambler.ru.*

**Abstract.** *The article is devoted to the medal art associated with the Radziwill family, whose representatives were at the origins of creating storage boxes for coin collections in Belarus. The number and variety of medals, with which on can trace very significant political and historical events, is impressive. In addition, they are real monuments of the Baroque style.*